МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА

# ПОСТАНОВЛЕНИЕ

29.01.2020 № 5

г. Мінск

г. Минск

Аб гісторыка-культурных каштоўнасцях

На падставе падпункта 1.2 пункта 1 і пункта 4 артыкула 94, пункта 6 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзацаў другога – чацвёртага падпункта 5.13 і абзаца трэцяга падпункта 5.14 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры ад 15.01.2020 № 04-01-02/1 Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Пазбавіць статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці матэрыяльную гісторыка-культурную каштоўнасць ”Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку” ў в. Обчын, 3,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, урочышча Гарадок, Любанскага раёна Мінскай вобласці.

2. Унесці ў главу 1 ”Матэрыяльныя нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь (незалежна ад паходжання)“ раздела І Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь наступныя змяненні:

2.1. у падраздзеле ”г. Брэст“ пазіцыю

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Трышынскія могілкі | XIX стагоддзе | г.Брэст, вул.Маскоўская, могілкі, у межах агароджы | 3“ |

замяніць пазіцыяй

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Трышынскія могілкі (у межах агароджы) | XIX стагоддзе | г.Брэст, вул.Маскоўская | 3“; |

2.2. у падраздзеле ”Лёзненскі раён“ пазіцыі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | г.п.Лёзна, на паўночнай ускраіне пасёлка | 3 |

Зак. 1336.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | в.Бабінавічы | 3“, |
| ”Брацкія магілы | 1941–1944 гады | в.Веляшковічы | 3“, |
| ”Вайсковыя могілкі | 1943–1944 гады | в.Крынкі, на тэрыторыі племзавода ”Крынкі“ | 3“, |
| ”Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | в.Надзёжына | 3 |
| Брацкія магілы | 1943–1944 гады | в.Пагосцішча, каля школы | 3“, |
| ”Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | в.Стасева | 3“, |
| ”Брацкая магіла | 1941–1944 гады | в.Якубаўшчына | 3“ |

замяніць адпаведна пазіцыямі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | г.п.Лёзна, на паўночнай ускраіне пасёлка, на Адаменскай горцы | 3 |
| Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | аграгарадок Бабінавічы | 3“, |
| ”Брацкія магілы | 1941–1944 гады | аграгарадок Веляшковічы | 3“, |
| ”Вайсковыя могілкі | 1943–1944 гады | аграгарадок Крынкі, каля скрыжавання вул.Дуброўскага і вул.Школьная | 3“, |
| ”Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | аграгарадок Надзёжына | 3 |
| Брацкія магілы | 1943–1944 гады | в.Пагосцішча, у канцы вул.Цэнтральная | 3“, |
| ”Вайсковыя могілкі | 1941–1944 гады | аграгарадок Стасева | 3“, |
| ”Брацкая магіла | 1941–1944 гады | аграгарадок Якубаўшчына | 3“; |

2.3. у падраздзеле ”Полацкі раён“ пазіцыі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Ансамбль Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра: | | г.Полацк, вул.Еўфрасінні Полацкай, на правым беразе р. Палата | 2 |
| Спаса-Праабражэнская царква. Роспісы ў інтэр’еры | XII стагоддзе | вул.Еўфрасінні Полацкай, 59 | 0 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| "цёплая" царква | першая палова XIX стагоддзя | | без катэгорыі |
| Крыжаўзвіжанская царква | 1893–1897 гады | | 2 |
| манастырскі корпус | пачатак XVIII стагоддзя | | 3 |
| манастырскі корпус | пачатак XX стагоддзя | | без катэгорыі |
| брама-званіца | канец XIX стагоддзя | | 3 |
| Тэрыторыя Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра | XII стагоддзе | г. Полацк, вул. Еўфрасінні Полацкай, 59 | 3" |

замяніць адпаведна пазіцыямі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| "Ансамбль Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра: | | г.Полацк, вул.Еўфрасінні Полацкай, на правым беразе р.Палата | 2 |
| Спаса-Праабражэнская царква. Роспісы ў інтэр'еры | XII стагоддзе | вул.Еўфрасінні Полацкай, 89/1 (інв. № 250/С-43569) | 0 |
| "цёплая" царква | сярэдзіна XIX стагоддзя | вул.Еўфрасінні Полацкай, 89/2, (інв. № 250/С-43596) | 3 |
| Крыжаўзвіжанская царква | 1893–1897 гады | вул.Еўфрасінні Полацкай, 89/3, (інв. № 250/С-43598) | 2 |
| манастырскі корпус | пачатак XVIII стагоддзя | вул.Еўфрасінні Полацкай, 89/4, (інв. № 250/С-2808) | 3 |
| манастырскі корпус | пачатак XX стагоддзя | вул.Еўфрасінні Полацкай, 89, (інв. № 250/С-41906) | 3 |
| брама-званіца | канец XIX стагоддзя | вул.Еўфрасінні Полацкай, 89/6, (інв. № 250/С-43788) | 3 |
| Тэрыторыя Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра | XII – пачатак XX стагоддзя | г.Полацк, тэрыторыя, абмежаваная ўмоўнай лініяй, якая праходзіць на поўначы - па агароджы манастырскай тэрыторыі; на ўсходзе – у створы агароджы манастырскай тэрыторыі на поўдзень да берагавой лініі р. Палата; на поўдні - на ўсход па берагавой лініі р. Палата; на захадзе - на поўнач па берагавой лініі р.Палата да паўночна-ўсходняга кута агароджы манастырскай тэрыторыі | 3"; |

2.4. у падраздзеле ”Слонімскі раён“ пазіцыі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Комплекс былой сядзібы ”Альберцін“:<br>сядзібны дом<br>два флігелі<br>стайня<br>брама<br>парк | першая палова XIX стагоддзя | г.Слонім, вул.Калгасная, 8 | 2“, |
| ”Магіла генерала М.Лявіцкага | 1831 год | г.Слонім, вул.Лумумбы | 3“, |
| ”Спаса-Праабражэнскі сабор | XVII – 50-я гады XIX стагоддзя | г.Слонім, вул.Пушкіна, 1 | 3“, |
| ”Гарадзішча Азярніца-1 | VIII стагоддзе да н.э. – III стагоддзе н.э. | в.Азярніца, 0,2 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Татарская гара, 0,4 км на ўсход ад гаспадарчага комплекса і зернесховішчаў | 3 |
| Брацкая магіла | 1941, 1944 гады | в.Азярніца | 3“, |
| ”Каменны могільнік Навасёлкі-1 | XIII–XIV стагоддзі | в.Навасёлкі, паміж вёскамі Навасёлкі – Высоцк – Вішава, 160 м на паўночны ўсход ад вёскі Навасёлкі, на тэрыторыі старых вясковых могілак | 3“, |
| ”Брацкая магіла | 1944 год | в.Сасноўка | 3“, |
| ”Брацкая магіла | 1941–1944 гады | в.Сялявічы | 3 |
| Касцёл Святой Барбары | другая палова XIX стагоддзя | в.Сялявічы, вул.Савецкая | 3“ |

замяніць адпаведна пазіцыямі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Комплекс былой сядзібы ”Альберцін“:<br>сядзібны дом<br>два флігелі<br>стайня<br>брама<br>парк | першая палова XIX стагоддзя | г.Слонім<br><br>вул.Калгасная, 4<br>вул.Калгасная, 2<br>вул.Калгасная, 8<br>вул.Калгасная, 4<br>вул.Калгасная, 4 | 2“, |
| ”Магіла генерала М.Лявіцкага | 1831 год | г.Слонім, вул.Ружанская | 3“, |
| ”Спаса-Праабражэнскі сабор | XVII – 50-я гады XIX стагоддзя | г.Слонім, вул.Пушкіна, 2 | 3“, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Гарадзішча Азярніца-1 | VIII стагоддзе да н.э. – III стагоддзе н.э. | аграгарадок Азярніца, 0,2 км на паўночны захад ад аграгарадка, ва ўрочышчы Татарская гара, 0,4 км на ўсход ад гаспадарчага комплекса і зернесховішчаў | 3 |
| Брацкая магіла | 1941, 1944 гады | аграгарадок Азярніца | 3“. |
| ”Каменны могільнік Навасёлкі-1 | XIII–XIV стагоддзі | аграгарадок Навасёлкі, паміж аграгарадком Навасёлкі і вёскамі Высоцк – Вішава, 160 м на паўночны ўсход ад аграгарадка Навасёлкі, на тэрыторыі старых вясковых могілак | 3“. |
| ”Брацкая магіла | 1944 год | аграгарадок Сасноўка | 3“. |
| ”Брацкая магіла | 1941–1944 гады | аграгарадок Сялявічы | 3 |
| Касцёл Святой Барбары | другая палова XIX стагоддзя | аграгарадок Сялявічы, вул.Савецкая | 3“: |

2.5. у падраздзеле ”Любанскі раён“ выключыць пазіцыю:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку | VI стагоддзе да н.э. – I стагоддзе н.э. | в. Обчын, 3,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, урочышча Гарадок | 3“. |

3. У падраздзеле ”Лёзненскі раён“ главы 2 ”Матэрыяльныя рухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь (незалежна ад паходжання)“ раздела I Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пазіцыю

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Звон | 1727 год | в. Калышкі | 3“ |

замяніць пазіцыяй

| | | | |
|---|---|---|---|
| ”Звон | 1727 год | г.п.Лёзна, вул.Леніна, 90, званіца Царквы Узвіжання Крыжа Гасподняга | 3“. |

4. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе падпісання.

Міністр Ю.П.Бондар